III, за свои поиски «правды» в 1525 г. был осужден Соборным судом и сослан в Иосифо-Волоколамский монастырь по обвинению в протурецкой ориентации [5, с. 193].

Однако даже если рассматривать ссылки на опыт Османской империи лишь в качестве гиперболы, логично предположить, что впечатление образованного человека той эпохи о ее стабильности и процветании имело, видимо, определенные фактические основания и могло оказать влияние на формирование представлений о путях государственного строительства.


1. Альфан, Л. Варвары. От Великого переселения народов до тюркских завоеваний XI века / Луи Альфан ; пер. с фр. М.Ю. Некрасова. – СПб. : Евразмя, 2003. – 416 с.
2. Будовниц, И.У. Идеологическая борьба в русской публицистике / И.У. Будовниц. – М.: Изд-во Академии наук СССР, 1960. – 491 с.
3. Ионина, Н.А. Стамбул. История. Легенды. Предания / Н.А. Ионина. – М.: Вече, 2007. – 384 с. – (Тайны знаменитых городов).
4. История дипломатии : [сб.] / сост. А. Лактионов. М. : АСТ–АСАТ Москва, 2006. – 943, [1] с.
5. История политических и правовых учений : учебник для вузов / под общей редакцией члена-корреспондента РАН В. С. Нерсесянца. – М. : ИНФРА-М, 1996. – 727 с.
6. Ле Гофф, Ж. Цивилизация средневекового Запада: пер. с фр. / Жак Ле Гофф; общ. ред. Ю.Л. Бессмертного ; послесл. А.Я. Гуревича. – М.: Издательская группа Прогресс, Прогресс-Академия, 1992. – 376 с.
7. Пересветов, И. Сочинения / подгот. текст А. А. Зимин. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1956
8. Псковские летописи. – М. : Языки славянской культуры, 2003. – 256 с. – (Полное собрание русских летописей. – Т. V. Вып. 1).
9. Шапошник, В.В. Церковно-государственные отношения в России в 30-80-е годы XVI века / В.В. Шапошник ; отв. ред. Ю.В. Кривошеев.. – СПб.: Санкт-Петербургский государственный университет (СПбГУ), 2006. – 568 с.


**Латушкін А.М.**

## АКТ ПЕРАМІР'Я ПАМІЖ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ І ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ ЛІТОЎСКІМ 1556 г. З РАСІЙСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ: ПЫТАННІ ПРАВЕНІЕНЦЫІ[1]

Сярод складу комплекса арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў архіва Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), які адлюстраваны ў вопісе ад 26 лістапада 1623 г., асобную групу ўтвараюць акты XV – пач. XVII ст. аб міры і перамір'і паміж вялікімі князямі літоўскімі і вялікімі князямі маскоўскімі, а таксама ўладарамі зямель, што пазней увайшлі ў склад Расійскай дзяржавы – Ноўгарад, Пскоў, Цвер, акты васальнай залежнасці князёў дынастыі Навасільскіх і інш. [3, s. 2–13; 7; 20]. Згодна з уліковай дакументацыяй архіва ВКЛ гэта група мае назву "Старажытныя і сучасныя перамір'і з Масквой" ("Inducye Moskiewskie dawne y teraznieysze") і ўключае 17 актаў ад пагаднення вялікага князя літоўскага Вітаўта з вялікім князем Барысам Аляксандравічам Цвярскім 1427 г. (?) да перамір'я паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай 1601 г. (у тым ліку і акт прысягі князя Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага каралю польскаму Уладыславу 1401 г., што ў гістарыяграфіі трактуецца аднак як унійны). 9 з іх да нашага часу захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве (далей – AGAD), куды патрапілі ў складзе варшаўскай часткі Архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у 1946 г. [20]. Астатнія 8 з 17 актаў у розны час былі страчаны са складу архіва і іх сучаснае месцазнаходжанне або застаецца невысветленым, або правеніенцыя і сувязь з архівам ВКЛ дагэтуль не ўстаноўлены.

У межах даследаванняў аўтара, прысвечаных рэканструкцыі складу і аднаўленню цэласнасці комплекса арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў 1387 – 1601 гг. архіва ВКЛ адна з пазіцый, якая адносіцца да страт, была выяўлена ў фондах Расійскай Нацыянальнай Бібліятэкі ў Санкт-Пецярбурзе (далей – РНБ).

У вопісе архіва ВКЛ ад 26 лістапада 1623 г. фігуруе дакумент пад назвай: " List przymierny tego z kniazia Moskiewskiego z Zygmuntem Augustem do lat szesc przez X(ię)cia Zbaraskiego" [3, s. 12]. Вядома, што шасцігадовае перамір'е паміж вялікім князем літоўскім і каралем польскім Жыгімонтам II Аўгустам і вялікім князем маскоўскім Іванам Васілевічам было заключана ў Маскве пасольствам на чале з ваяводам віцебскім Стэфанам Андрэевічам Збаражскім, якое адбылося 23 студзеня –

10 лютага 1556 г. Матэрыялы пасольства апублікаваныя і шырока вядомыя ў навуковай літаратуры, прысвечанай тэме гісторыі міждзяржаўных зносін ВКЛ і Расійскай дзяржавы ў XVI ст., а таксама праблеме эвалюцыі манархічнай улады ў Расіі і царскай тытулатуры Івана Васілевіча "Грознага"

[1] Даследаванне выканана пры фінансавай падтрымцы Музея гісторыі Польшчы (Muzeum Historii Polski w Warszawie), стыпендыя за 2016 г., праект "Archiwum ordynacji Nieświezskiej ks. Radziwiłłów: historia, zasoby oraz miejsce w dziedzictwie kulturalnym narodów Europy Centralnej i Wschodniej".

Репозиторий ВГУ

(гл. працы М.А. Дьяканава (1855–1919), У.Е. Вальдэнберга (1871–1940), У.І. Саввы (1865–1920) і інш.) [17, с. 485–531; 14, с. 202 – 205; 18, с. 1–21; 19].

Перамір'е 1556 г. стала пятым па ліку, якія былі заключаныя паміж дзяржавамі пасля вайны 1534–1537 гг. Папярэднія датуюцца: 1537 г. – на 5 гадоў, 1542 г. – на 7 гадоў, 1549 г. – на 5 гадоў, 1553 г. – на два гады. Перашкодай у заключэнні вечнага міру ў азначаны перыяд былі абвастрэнне суперніцтва за дамініраванне ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне паміж падуладнымі Жыгімонту ІІ Аўгусту ВКЛ і Каралеўствам Польскім з аднаго боку, і Расійскай дзяржавай, выкліканае ўмацаваннем цэнтральнай улады ў апошняй і актыўнай экспансіянісцкай палітыкай Івана IV. Сярод канкрэтных прычын былі ўзаемныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі абодвух дзяржаў, а таксама, як адна з найбольш істотных перашкод, што называлася маскоўскім бокам, – нязгода караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта ІІ Аўгуста выкарыстоўваць у тытулатуры Івана IV найменне "цар", пасля прыняцця ім тытула ў 1547 г. Перамір'е 1556 г. стала апошнім напярэдадні т. зв. Інфлянцкай вайны паміж ВКЛ і Расійскай дзяржавай. Неўзабаве пасля даты яго заканчэння – 25 сакавіка 1562 г. – маскоўскі бок распачаў ваенныя дзеянні на ўсходняй мяжы ВКЛ і менш чым праз год Іван Васілевіч заняў Полацк.

Названыя вышэй перамірныя акты 1537 – 1553 гг., выдадзеныя ад імя маскоўскага правіцеля супрацьлегламу боку, дайшлі да нашага часу ў складзе калекцыі пергамінаў AGAD, куды яны патрапілі разам з польскай часткай Архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў [2]. Выключэннем з'яўляецца перамірны акт 1556 г. Дакумент фіксуецца ў вопісах Архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, складзеных у 1721–1722 гг., 1744 г., 1755 г. [4, s. 21; 5, s. 11; 6, s. 11]. Пазней дакумент у вопісах архіваў Радзівілаў больш не згадваецца.

У складзе фондаў аддзела рукапісаў РНБ захоўваецца перамірны акт паміж Расійскай дзяржавай і краінамі, падуладнымі каралю польскаму, вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту ІІ Аўгусту, датаваны "1555 – 1556 гг. до марта 25" [1]. Аналіз яго зместу і знешніх прыкмет дазваляе сцвярджаць, што гэта арыгінал экзэмпляру, выдадзенага ад імя вялікага князя маскоўскага Івана Васілевіча паслам ВКЛ 7 лютага 1556 г. ў Маскве (дакумент мае толькі пазначэнне года, дзень і месяц устаноўлены па матэрыялах пасольства і адпавядаюць даце цырымоніі "крыжацалавання") [17, с. 509–510]. Важнае значэнне для высвятлення гісторыі захоўвання дакумента і яго паходжання маюць запісы на адвароце акта. Два з іх адпавядаюць уліковым дадзеным вопісаў архіва ВКЛ і Архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў. У правым ніжнім куце аркуша справа, чорным чарнілам пазначана: "List 13" (выпраўлена на 12). Згодна з вопісам архіва ВКЛ ад 26 лістапада 1623 г. – дакумент знаходзіўся ў шуфлядзе "С 2" і па ліку быў 12-ты [3, s. 12]. Аднак найбольш адназначна аб паходжанні сведчыць наступны запіс. Там жа карычневым чарнілам вышэй папярэдняга запісу: "Litera C Szuflada 3 Sztuka 6"; ніжэй, пасля папярэдняга запісу 1623 г. па ніжняму краю аркуша: "List przemirny Cara Moskiewskiewskiego[1] Iwana z krolem Polskim Zygmuntem Auguste(m) przez kniazia Stefana Andriewicza[2] Zbaraskiego[3] woiewode Witebskiego na lat szesć pisan na moskwie Roku od stworzenia Swiata 7064[4]." Дадзены запіс даслоўна паўтарае нумар і назву дакмента, згодна з вопісам, складзеным архіварыусам Радзівілаў А. Гафауксам у снежні 1721–1722 г. на комплекс дакументаў дзяржаўнага архіва ВКЛ, які ў той час захоўваўся імі, верагодна, у Бялай – тагачаснай рэзідэнцыі ардынатаў нясвіжскіх. Дадзеная форма пазначэння ўліковага архіўнага нумара дакументаў, распрацаваная названым архіварыусам, паўтараецца і на іншых дакументах з комплекса дзяржаўных актаў Архіва Нясвіжскай ардынацыі, у тым ліку з AGAD.

| **Запіс на адвароце перамірнага акта 1556 г. з фондаў РНБ [1, с. 1 об.]** | **Нумар і назва акта згодна з вопісам Архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў ад снежня 1721–1722 гг. [8, s. 21]** |
|---|---|
| *Litera C Szuflada 3 Sztuka 6.<br>List przemirny Cara Moskiewskiewskiego Iwana z krolem Polskim Zygmuntem Auguste(m) przez kniazia Stefana Andriewicza Zbaraskiego woiewode Witebskiego na lat szesć pisan na moskwie Roku od stworzenia Swiata 7064."* | *Rok 7064. List przemierny Cara moskiewskiego Iwana z krolem polskim Zygmuntem Augustem przez kniazia Stefana Andreiewicza Zbaraskiego wojewodę witebskiego na lat sześć pisan na Moskwie z pieczęcio iedną wiszą̨n(co). Litera C Szuflada 3. Sztuka 6.* |

[1] *так у дакуменце*
[2] *так у дакуменце*
[3] *напісана над радком*
[4] *падкрэслена*



Репозиторий ВГУ

Матэрыял дакумента – пергамін. Памеры: шырыня 57,5 см., вышыня 57 см., вышыня ніжняй часткі акта падкладзенай пад пячатку ад 9,7 см. (левы край) да 10,4 см. (правы край). Стан – добры, на адвароце акта маюцца сляды рэстаўрацыі паперай па цэнтральным вертыкальным згібе ў трох месцах, тэкст выразны, выкананы скорапісам Расійскай дзяржавы сярэдзіны XVI ст. Прывесістая пячатка вялікага князя маскоўскага Івана Васілевіча з тытулам "царь и великии князь", баваўняны шнур цёмна-чырвонага колеру, чырвоны воск, d = 8,5 см.

Тэкст дакумента па спісе ў пасольскіх кнігах надрукаваны ў 1887 г. [17, с. 511–514]. Фотаздымак дакумента і пячаткі апублікаваны галоўным бібліятэкарам Аддзела рукапісаў РНБ С.Г. Жэмайцісам у 2009 г. Дакументы экспанаваўся на выставе, арганізаванай у Прэзідэнцкай бібліятэцы і прысвечанай гісторыі расійскай дзяржаўнасці, адчыненай у маі 2009 г. [9, с. 70–71]. Адметна, што на тытульным баку вокладкі выдання змешчана фота аднаго з бакоў пячаткі менавіта з акта, што паходзіць з фондаў РНБ, акта – з архіва ВКЛ. Фота акта даступна таксама на сайце РНБ.

Адносна пытання правеніенцыі акта і гісторыі яго ўключэння ў фонды РНБ можна адзначыць наступнае. Унізе тытульнага боку акта пад загнутай уверх часткай пергаміна, падкладзенай пад пячатку правей месца мацавання шнура ад пячаткі чорным чарнілам выкананы запіс: "Ex Muzaeo Petri Dubrowsky" [1]. Пётр Пятровіч Дуброўскі (1754–1816) – заснавальнік і першы галоўны захавальнік т.зв. Дэпо Манускрыптаў (пазнейшага аддзела рукапісаў РНБ) Імператарскай Публічнай Бібліятэкі ў Санкт-Пецярбурзе. Ураджэнец Кіева, выпускнік Кіева-Магілянскай Акадэміі (1772 г.), з 1777 г. па жнівень 1792 г. ён служыў пры канцылярыі рускай пасольскай місіі ў Парыжы. За час свайго знаходжання ў Францыі, а таксама падчас падарожжаў па Еўропе гэта асоба сабрала ўнікальную калекцыю помнікаў пісьмовай культуры свету. Яна ўтрымлівала каля 16000 рукапісных кніг і дакументаў на грэчаскай, стараславянскай, заходнееўрапейскіх мовах, усходнія манускрыпты і іншыя матэрыялы за перыяд V–XVIII стст., сярод якіх знаходзіліся ўнікальныя помнікі пісьменнасці. У 1805 г. збор быў выкуплены расійскім імператарам Аляксандрам I для Імператарскай Публічнай Бібліятэкі [8; 13; 16]. У складзе прыватнай калекцыі меўся і фрагмент архіўнай "радзівіліяны", які фактычна склаў аснову знакамітай т. зв. польскай часткі калекцыі аўтографаў П.П. Дуброўскага (ф. 971) [10; 15]. Аднак значная яе частка патрапіла і да іншых калекцый аддзела рукапісаў, у адносінах да якіх ў бібліятэцы традыцыйна прымяняецца найменне "фонд". Згодна са сцвярджэннем М.М. Крома, акрамя ф. 971 "радзівіліяна" П.П. Дуброўскага ўтрымліваецца ў фондах: 1) ф. 293 "Западно-русские акты"; 2) ф. 532 "Основное собрание актов и грамот"; 3) ф. 958 "Собрание разноязычных рукописных книг" [15, с. 10]. Такім чынам, з дастатковай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што перамірны акт 1556 г. першапачаткова таксама належыў менавіта да "радзівіліяны" П.П. Дуброўскага, адзіны комплекс якой быў раздзелены ў першай палове XIX ст. ў выніку чаго акт па намінальнай прыкмеце патрапіў да ф. 532.

Паходжанне самой "радзівіліяны" ва ўласнасці калекцыянера да канца не высветлена. Т.У. Луізава сцвярджала, што дакументы, былі набытыя ім часткова яшчэ ў Францыі, а рэшта, верагодна, пазней" [13, с. 151]. Т.М. Карпэева на аснове аналіза адзнак архіўнага ўліку і іншых правеніенцыйных прыкмет сцвярджала, што ў рукі калекцыянера патрапілі адразу некалькіх архіваў Радзівілаў, прычым іх цэлыя часткі. Адзін з іх на падставе экслібрысаў ідэнтыфікаваны ёю як Несвіжскі. З яго, па меркаванні даследчыцы, матэрыялы патрапілі да П.П. Дуброўскага апасродкавана праз зборы Залускіх, з якіх яны перайшлі ў рукі прыватных асоб. Паходжанне ж большай часткі рукапісаў Т.Н. Капрэева звязвала з не менш чым дзвюма іншымі архівамі роду Радзівілаў, верагодна біржанскай галіны [10, с. 138–142, 149]. М.М. Кром, падзяляючы высновы папярэдняй даследчыцы адным з месцаў ранейшага захоўвання "радзівіліяны" РНБ назваў Кейданскі архіў Радзівілаў [15, с. 13–14].

Асабістая архіўная спадчына П.П. Дуброўскага захавалася ў малой ступені і не ўтрымлівае істотных звестак адносна правеніенцыі разглядаемай часткі яго калекцыі. Тое ж можна сказаць і аб матэрыялах яго службовай дзейнасці ў архіве РНБ, што пакуль не дае магчымасці цалкам высветліць пытанне. Існуючыя на цяперашні момант дадзеныя аб гісторыі архіваў роду Радзівілаў дазваляюць, аднак, сцвярджаць, што ў другой палове у XVIII ст. асноўная маса найважнейшых матэрыялаў па гісторыі рода была сканцэнтравана ў Нясвіжы. Наяўнасць у

[1] Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць галоўнаму бібліятэкару Аддзела рукапісаў РНБ С.Г. Жэмайцісу за дапамогу ў выяўленні і апрацоўцы правеніенцыйных прыкмет акта і садзейнічанне ў даследаваннях.



Рэпазіторый ВДУ

калекцыі П.П. Дуброўскага перамірнага акта 1556 г., захоўванне якога ў Нясвіжскім архіве пацвярджаецца вопісамі, дазваляе звязваць і паходжанне ўсёй "радзівіліяны" РНБ менавіта з нясвіжскімі зборамі магнацкага роду. Абставіны, пры якіх мог адбыцца выхад са складу архіва такога беспрэцэдэнтнага па аб'ёму і каштоўнасці комплекса матэрыялаў, у тым ліку агульнадзяржаўнага значэння, патрабуюць далейшага высвятлення. Аднак, найбольш верагодным часам гэтай падзеі мог быць перыяд 1790–1812 гг. Верхняя мяжа – гэта заканчэнне працоўнай дзейнасці П.П. Дуброўскага ў Імператарскай Публічнай Бібліятэцы. Ніжняя мяжа абумоўлена сыходам са свету Караля Станіслава Радзівіла "Пане Каханку" (1734–1790) і пачаткам перыяду кіравання маёмасцю непаўнагадовага Даменіка Гераніма Радзівіла (1786–1813) апекунамі і іх адміністратарамі, у прыватнасці, Міхалам Геранімам Радзівілам (1744–1831) і Л. Камінскім, што суправаджалася шматлікімі фінансавымі злоўжываннямі і перамяшчэннямі архіваў. Нясвіжскі замак у гэты час падвяргаўся нападу расійскіх войск (чэрвень 1792 г.), вывозіўся ў Варшаву і часткова ў Нябораў – рэзідэнцыю ваяводы віленскага, апекуна Міхала Гераніма Радзівіла. У Няборове яго дзяржаўная частка заставалася на працягу ўсяго XIX ст. Астатнія матэрыялы вярнуліся ў Нясвіж у 1803–1805 гг. [11]. Менавіта на азначаны перыяд прыпадае таксама дзейнасць Каятана Квяткоўскага (1769–1852) – бібліятэкара ў Нясвіжы ў перыяд 1804–1810 гг., асобы, з якой звязаны незаконны выхад са складу архіва вялікага комплексу рукапісаў па гісторыі ВКЛ і роду Радзівілаў, асноўная маса якіх патрапіла да збораў графаў Дзялынскіх у Курніку [12].


1. Российская национальная библиотека. Отдел рукописей. – Ф. 532 "Основное собрание актов и грамот". Оп. 1. № 141.
2. Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD). – Zbiór dokumentów pergaminowych (ZDP). – Sygnatury 7599, 7623, 7670, 7702.
3. AGAD. – Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawski (AR) – Dział XXVII. – Sygn. 11. Regestr przywilegiów W.X.Lit. oddanych do zamku Xiążąt Radziwiłłów 26.11.1623 r.
4. AGAD. – AR – Dz. XXVII. – Sygn. 14. "Regestr przywilejów dawnych 1722 [część lub tom] 1". Oprac. A. Goffoux. Grudzień 1721 r., 1722 r. – 34 s.
5. AGAD. – AR – Dz. XXVII. – Sygn. 27. Regestr przywilegiów Unii Litewskiej z Korono. – b.d. lata 40-te XVIII w. [1744 r.] – 12 s.
6. AGAD. – AR – Dz. XXVII. – Sygn. 29. Lustracja archiwów zamku nieświeskiego. X 1755 r. – 35 + 1 s.
7. Антанавичюс, Д. Найден реестр оригинальных книг Литовской Метрики XVI в. / Д. Антанавичюс. // Новости Литовской Метрики. – № 12. / Инст. ист. Литвы. – Вильнюс: Leidykla, 2011. – С. 18–25.
8. Воронова, Т.П. П.П. Дубровский – первый хранитель «Депо манускриптов» публичной библиотеки / Т.П. Воронова // Археографический ежегодник. – М.: Наука, 1981.– С. 123–130.
9. История российской государственности : каталог выставки / [вступ. слово: Д. Медведев; авт. вступ. ст.: А.Р. Соколов, В.Н. Зайцев]. – Санкт-Петербург : Президентская библиотека, 2009. – 120 с.
10. Копреева, Т.Н. Обзор польских рукописей Государственной Публичной Библиотеки (Собрание П.П. Дубровского) / Т.Н. Копреева // Труды Государственной Публичной Библиотеки имени М.Е. Салтыкова-Щедрина. – Л.:ГПБ, 1958. – Т. V (8). – С. 137–165.
11. Латушкін, А.М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII – першай палове XX стст.: дыс. на суіск. вуч. ступ. канд. гіст. навук: 05.25.02 / А.М. Латушкін; БДУ. – Мінск, 2007. – 296 [9] л.
12. Латушкін, А.М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у пачатку XIX ст. (справа К. Квяткоўскага) / А.М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік / гал. рэд. Э. М. Савіцкі [і інш.]. – Вып. 13. – 2012 г. – С. 149–160.
13. Луизова, Т.В. Собрание рукописей П.П. Дубровского в Государственной публичной библиотеке имени М.Е. Салтыкова-Щедрина / Т.В. Луизова // Вопросы истории.– 1952.– № 8.– С. 150–154.
14. Памятники истории Восточной Европы. Источники XV – XVII вв. Т. II. / Ред. кол. И. Граля, М. Дыго, М. Нагельский [и др.]. – М.; Варшава: Археографический центр, 1997. – 330 с.
15. Памятники истории Восточной Европы. Источники XV – XVII вв. (Monumenta historica res gestas Europae Orientalis illustrantia. Fontes XV – XVII saec.). Т. VI. / Сост. М. М. Кром. – Москва-Варшава: изд. «Древлехранилище», 2002. – 267 с.
16. Петр Дубровский (1754 – 1816) и его коллекция : [альбом] / Рос. нац. б-ка; [сост.: Н.А. Елагина и др. текст: Н.А. Елагина предисл.: В.Н. Зайцев, В.А. Лопатников]. – СПб : Рос. нац. б-ка, 2004. – 30 с.
17. Сборник Императорского Русского Исторического Общества: 1867 – 1916. 148 т. – Т. 59 / Том издан под наблюдением Г. Ф. Карпова. – СПб., 1887. – [10], XVI, 630 с., 98 стб.
18. Сборник князя Оболенского. – М.: Тип. Лазаревых Института восточных языков, 1838. – № 5.
19. Хорошкевич, А. Л. Россия в системе международных отношений середины XVI в. / А. Л. Хорошкевич. – М. : Древлехранилище, 2003.– 620 с.
20. Mikulski, W. Dokumenty z archiwum WXL w archiwum warszawskim Radziwiłłów / W. Mikulski // Miscellanea historico-archivistica. – 1997. – T. 7. – S. 71–83.


Рэпазіторый ВДУ

**Безмацерных Д.А.**

## АКТАВЫЯ КНІГІ БРАСЛАЎСКАГА ЗЕМСКАГА СУДА ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

У 1565–1566 гг. у Вялікім Княстве Літоўскім была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная і судзебная рэформы, у выніку якой быў утвораны сярод іншых і Браслаўскі павет – адзін з самых маленькіх паветаў дзяржавы, а разам з гэтым на землях новаўтворанага павета была ўсталявана новая судовая сістэма, у рамках якой быў створаны земскі суд.